*УДК 94(476)«1861/1914»+352.075.31(476)(091)*

# УЕЗДНЫЙ ПРЕДВОДИТЕЛЬ ДВОРЯНСТВА В СИСТЕМЕ МЕСТНОГО УПРАВЛЕНИЯ И САМОУПРАВЛЕНИЯ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ (1861–1914)

***А. Р. ЛУДИЧ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Рассматриваются роль и место предводителя дворянства в системе уездного управления и самоуправления в пореформенный период. Объектом исследования выступает институт уездных предводителей дворянства в белорусских губерниях во второй половине XIX – начале XX в. Определены изменения в политике правительства по проведению дворянских выборов после восстания 1863–1864 гг. Обозначены основные функции уездных предводителей в сфере сословного самоуправления. Показаны основные направления деятельности местных предводителей дворянства в управлении уездными административными учреждениями. Охарактеризованы особенности функционирования института уездных предводителей дворянства на территории Беларуси. В результате анализа материалов законодательства и делопроизводства сделан вывод, что предводитель дворянства занял место полноценного руководителя уезда. На протяжении рассматриваемого периода наблюдалась тенденция к расширению полномочий предводителей дворянства, что свидетельствовало об их трансформации из представителей внутрисословных органов в представителей органов административных и общественных.

***Ключевые слова:*** Беларусь; белорусские губернии; уездные предводители дворянства; уездная администрация; дворянская корпорация; местные органы управления и самоуправления.

# ПАВЯТОВЫ ПРАДВАДЗІЦЕЛЬ ДВАРАНСТВА Ў СІСТЭМЕ МЯСЦОВАГА КІРАВАННЯ І САМАКІРАВАННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1861–1914)

***А. Р. ЛУДЗІЧ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Разглядаюцца роля і месца прадвадзіцеля дваранства ў сістэме павятовага кіравання і самакіравання ў парэформенны перыяд. Аб’ектам даследавання з’яўляецца інстытут павятовых прадвадзіцеляў дваранства ў беларускіх губернях у другой палове XIX – пачатку XX ст. Вызначаны змены ва ўрадавай палітыцы ў адносінах да дваранскіх выбараў пасля паўстання 1863–1864 гг. Раскрыты асноўныя функцыі павятовых прадвадзіцеляў у сферы саслоўнага самакіравання. Даследуюцца асноўныя напрамкі дзейнасці мясцовых прадвадзіцеляў у кіраванні павятовымі адміністрацыйнымі ўстановамі. Ахарактарызаваны асаблівасці функцыянавання інстытута павятовых прадвадзіцеляў дваранства на тэрыторыі Беларусі. У выніку аналізу матэрыялаў заканадаўства і справаводства зроблена выснова, што прадвадзіцель дваранства з’яўляўся паўнавартасным кіраўніком павета. На працягу разглядаемага перыяду праяўлялася тэндэнцыя да пашырэння паўнамоцтваў прадвадзіцеляў дваранства, што сведчыць аб іх трансфармацыі з прадстаўнікоў унутрысаслоўных органаў у прадстаўнікоў органаў адміністрацыйных і грамадскіх.

***Ключавыя словы:*** Беларусь; беларускія губерні; павятовыя прадвадзіцелі дваранства; павятовая адміністрацыя; дваранскія карпарацыі; мясцовыя органы кіравання і самакіравання.

**Образец цитирования:**
Лудзіч АР. Павятовы прадвадзіцель дваранства ў сістэме мясцовага кіравання і самакіравання на тэрыторыі Беларусі (1861–1914). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя*. 2020;1:38–46.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-1-38-46.

**For citation:**
Ludich AR. County marshal of nobility in the system of local government and self-government in Belarus (1861–1914). *Journal of the Belarusian State University. History*. 2020;1:38–46. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-1-38-46.

**Автор:**
***Андрей Романович Лудич*** – аспирант кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени исторического факультета. Научный руководитель – доктор исторических наук, профессор А. Г. Кохановский.

**Author:**
***Andrei R. Ludich***, postgraduate student at the department of modern and contemporary history of Belarus, faculty of history.
*aludich@mail.ru*

# COUNTY MARSHAL OF NOBILITY IN THE SYSTEM OF LOCAL GOVERNMENT AND SELF-GOVERNMENT IN BELARUS (1861–1914)

*A. R. LUDICH*[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article discusses the role and place of the marshal of nobility in the system of county administration and self-government in the post-reform period. The object of the study is the institute of county marshals of nobility in the Belarusian provinces in the second half of the 19th – early 20th century. The study deterncines the changes in the government policy of the Russian autocracy related to the noble elections in Belarus after the 1863–1864 uprising. The main functions of County leaders in the sphere of class self-government are revealed. The main directions of activity of local heads of nobility in management of administrative district institutions are shown. The characteristics of the functioning of the institute of county marshals of nobility on the territory of Belarus are given. As a result of analysis of the laws the conclusion is made that the marshal of the nobility took the place of a full head of county, and during the period under review, the trend of expanding the powers of the marshals of nobility, testified to their transformation from in-class bodies in administrative, public bodies.

***Keywords:*** Belarus; the Belarusian province; the marshal of nobility; county administration; noble corporation; local authorities; self-government.

## Уводзіны

У сістэме мясцовага самакіравання Расійскай імперыі важнае месца адводзілася саслоўным установам. Адмена прыгоннага права, развіццё капіталістычных адносін, трансфармацыя пад іх уплывам саслоўнай структуры грамадства, перспектывы развіцця палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферы падштурхоўвалі самадзяржаўе перадаць у рукі прадвадзіцеляў дваранства шырокія функцыі павятовага кіравання. Павятовы прадвадзіцель дваранства, з'яўляючыся прадстаўніком саслоўнага самакіравання, лічыўся важным звяном у сістэме мясцовага кіравання. На працягу ўсёй гісторыі існавання інстытута прадвадзіцеляў дваранства назіралася тэндэнцыя да павелічэння яго ролі ў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі на месцах. У выніку прадвадзіцель дваранства становіцца кіруючай асобай у павятовай адміністрацыі.

*Мэта* гэтага даследавання – вызначыць ролю і месца павятовага прадвадзіцеля дваранства ў сістэме мясцовага кіравання і самакіравання ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

Нягледзячы на тое што тэма функцыянавання дваранскіх органаў самакіравання ў парэформенны перыяд на тэрыторыі Беларусі выклікала навуковую цікавасць у даследчыкаў, некаторыя яе аспекты, у тым ліку фігура прадвадзіцеля дваранства як кіраўніка павета, засталіся па-за ўвагай. Дарэвалюцыйны публіцыст М. А. Каткоў станоўча адносіўся да інстытута прадвадзіцеляў дваранства і адзначаў, што на працягу разглядаемага перыяду ён аказваў значны ўплыў на ўсе сферы мясцовага кіравання [1]. А. П. Карэлін быў адным з першых савецкіх даследчыкаў, хто пачаў вывучаць карпаратыўную арганізацыю дваранскага саслоўя [2]. Унутраную палітыку стаўлення самадзяржаўя да дваранства беларускага краю даследавала С. М. Самбук [3]. Дзяржаўная служба дваранства, яго карпаратыўная арганізацыя і ўрадавая палітыка ў дачыненні да інстытута прадвадзіцеляў дваранства разглядаецца ў даследаваннях А. П. Жытко і С. А. Талмачовай [4; 5]. Аўтары прыйшлі да высновы, што самадзяржаўе праводзіла палітыку адхілення дваран каталіцкага веравызнання ад дзяржаўнай службы ў Беларусі, а вакантныя пасады займалі выхадцы з унутраных губерняў Расіі [5, с. 12]. На старонках манаграфіі А. Г. Каханоўскага «Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.)» на фоне развіцця мадэрнізацыйных працэсаў разгледжаны этапы і асаблівасці эвалюцыі саслоўных інстытутаў у Беларусі, у тым ліку і дваранскіх [6]. Аўтар адзначыў, што ўнутраная палітыка самадзяржаўя была накіравана на паслабленне дваранскай карпарацыі і вызначалася настойлівымі спробамі прыстасаваць яе да агульнарасійскага кантэксту [6, с. 265]. Звесткі аб структуры дваранскіх органаў і асноўных паўнамоцтвах прадвадзіцеляў прыведзены ў даведачных зборніках супрацоўнікаў Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства архіўнай справы [7].

## Асноўная частка

Інстытут прадвадзіцеляў дваранства быў створаны ў Расіі ў другой палове XVIII ст. і па меры ўключэння беларускіх зямель у склад імперыі інтэграваўся ў мясцовую сістэму саслоўнага самакіравання. Тым не менш ва ўрадавых колах неаднаразова абмяркоўвалася ідэя рэарганізацыі інстытута

прадвадзіцеляў дваранства ў сувязі з адменай прыгоннага права ў 1861 г., якая ліквідавала вотчынную ўладу памешчыкаў над сялянамі. Асаблівая ўвага надавалася стварэнню павятовай адміністрацыі і ўключэнню яе ў агульную бюракратычную сістэму. У прыватнасці, прапаноўвалася ўвесці каронную пасаду начальніка павета, абмежаваўшы кампетэнцыю павятовых прадвадзіцеляў унутрысаслоўнымі функцыямі. Аднак гэтыя намеры не былі рэалізаваны, таму што паніжэнне статусу прадвадзіцеля дваранства, падначаленне яго дзяржаўнаму чыноўніку выклікала б незадаволенасць у шырокіх памесных колах і разглядалася б як чарговае пасля вызвалення прыгонных сялян пазбаўленне высакароднага саслоўя яго «законных» прывілеяў.

Аднак кардынальныя змены на пачатку 1860-х гг. у сістэме дваранскага самакіравання Беларусі мелі палітычную прычыну. Царскі ўрад разумеў, што, прымаючы ўдзел у працы дваранскіх інстытутаў, вышэйшае саслоўе беларускіх губерняў станавілася больш арганізаваным, атрымлівала палітычны досвед і ў выніку аказвала значны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё краю [6, с. 192]. Калі хваля нацыянальна-вызваленчага руху закранула мясцовых дваран, то самадзяржаўе адрэагавала новымі зменамі, у першую чаргу ў парадку выбрання на пасады прадвадзіцеляў дваранства. Дваранскія сходы і выбары прадвадзіцеляў, якія павінны былі адбыцца ў снежні 1861 – студзені 1862 г., былі адменены [4, с. 203]. Цыркуляр міністра ўнутраных спраў П. А. Валуева ад 25 лютага 1861 г. забараніў правядзенне ў беларускіх губернях дваранскіх выбараў на два гады, а на пасады павятовых прадвадзіцеляў дваранства загадаў надалей прызначаць чыноўнікаў ад ураду «впредь до усмотрения»[1]. У сувязі з пераводам заходніх губерняў на ваеннае становішча па загадзе ад 5 жніўня 1861 г. віленскі генерал-губернатар атрымаў надзвычайныя правы прызначаць на пасады і здымаць з іх чыноўнікаў усіх ведамстваў[2]. Указ Камітэта міністраў ад 27 кастрычніка 1861 г. пашыраў сваю дзейнасць і на прадвадзіцеляў дваранства беларуска-літоўскіх губерняў[3].

Па меры заканчэння двухгадовага тэрміну забароны на дваранскія выбары на студзень – красавік 1863 г. у беларускіх губернях было прызначана правядзенне дваранскіх сходаў. Калі ў лютым 1863 г. у Віцебскай губерні паспяхова адбыліся павятовыя сходы, то на губернскі сход вясной 1863 г. большасць павятовых прадвадзіцеляў дваранства не даехала па прычыне ўзмацнення хваляванняў[4]. У Магілёўскай губерні дваранскія выбары ў сакавіку 1863 г. прайшлі больш паспяхова: былі абраны і губернскі, і павятовыя прадвадзіцелі дваранства[5]. Аднак падчас паўстання 1863–1864 гг. некаторыя з выбраных павятовых прадвадзіцеляў далучыліся да супраціўлення, што паслужыла прычынай іх звальнення і далейшага праследавання. У цыркуляры ад 19 жніўня 1863 г. М. М. Мураўёў загадаў мясцовым губернатарам з таго часу прызначаць на пасады прадвадзіцеляў чыноўнікаў ад ураду, а сам генерал-губернатар паабяцаў асабіста сачыць за гэтым[6]. У спісе, прадстаўленым начальніку краю ў студзені 1864 г., зафіксавана, што 7 з 10 павятовых прадвадзіцеляў дваранства, абраных мінулай вясной, былі прызначаны на пасады ўрадам[7].

Такім чынам, у 1863 г. мясцовая адміністрацыя канчаткова адмяніла правядзенне на тэрыторыі Беларусі выбараў прадвадзіцеляў дваранства і перайшла да прамога прызначэння на гэтыя пасады служачых ад ураду. У выніку прадвадзіцелямі дваранства станавіліся чыноўнікі, якія часам не мелі ні дваранскага паходжання, ні нерухомай маёмасці, ні аўтарытэту, ні ўплыву [6, с. 241]. Па гэтай прычыне віленскі генерал-губернатар А. Л. Патапаў дазволіў прызначаць кіраўнікамі дваранства асоб каталіцкага веравызнання [3, с. 82]. У адрас-календары Віленскага генерал-губернатарства на 1868 г. сцвярджалася, што 12 з 29 павятовых прадвадзіцеляў дваранства былі католікамі[8].

Пачынаючы з 1860-х гг. дваранства імперыі паступова губляла свае саслоўныя прывілеі і набліжалася па прававым становішчы да іншых саслоўных груп [6, с. 192]. Але, нягледзячы на рэзкі паварот дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да дваранства беларускага краю, урад не адважыўся ліквідаваць тут сам інстытут прадвадзіцеляў, сфера дзейнасці і абавязкі якіх неаднаразова змяняліся ў залежнасці ад патрабаванняў грамадства, мясцовай адміністрацыі і самадзяржаўя. Калі першапачаткова функцыяй павятовых кіраўнікоў дваранства ў адпаведнасці з заканадаўствам было загадванне ўсімі ўнутранымі справамі саслоўя, то на працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. старшыня дваранскай карпарацыі атрымаў кантроль над многімі мясцовымі органамі ўлады на тэрыторыі беларускіх губерняў. У выніку пад уплывам мадэрнізацыі грамадства ў другой палове XIX ст. становішча павятовага прадвадзіцеля ў мясцовай іерархіі яшчэ больш узмацнілася.

Заканадаўствам прадугледжвалася, што павятовы прадвадзіцель, які выбіраўся мясцовым дваранствам, не знаходзіўся ў падпарадкаванні гу-

[1]Нац. гіст. арх. Бел. (далей – НГАБ). Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 31413. Арк. 11.
[2]Полное собрание законов Российской империи (далее – ПСЗРИ). Собр. 2. СПб., 1861. Т. 36. Отд-ние 1, № 37328. С. 225.
[3]*Подорожняя Е. А.* Местные органы государственной власти и управления в Беларуси (1861–1914 гг.) : структура, функции, кадры : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. Минск, 2014. С. 48.
[4]НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 31413. Арк. 45.
[5]Там жа. Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 883. Арк. 25.
[6]Там жа.
[7]Там жа. Спр. 929. Арк. 70–71.
[8]Адрес-календарь Виленского генерал-губернаторства на 1868 г. СПб. : Типогр. К. Вульфа, 1868. С. 18–725.

бернскага прадвадзіцеля, а дзейнічаў самастойна [7, с. 219]. Нярэдка ў выпадку адсутнасці губернскага прадвадзіцеля дваранства адзін з павятовых кіраўнікоў мог на вызначаны перыяд заняць гэту пасаду і выконваць яго абавязкі. Аднак у беларускім краі такі парадак быў парушаны. Як было сказана вышэй, адмяніўшы выбары прадвадзіцеляў, урад перайшоў да практыкі прызначэння, таму пасада кіраўніка дваранства заняла трывалае месца ў вертыкалі ўлады. У такіх умовах губернатары і ў некаторай ступені губернскія прадвадзіцелі выкарыстоўвалі павятовых кіраўнікоў для вырашэння самых розных задач, бо апошнія былі адным з самых надзейных і эфектыўных органаў улады ў сістэме мясцовага кіравання і самакіравання.

Прадвадзіцелі дваранства карысталіся ўсімі перавагамі дзяржаўнай службы, што давала права на атрыманне чыноў, узнагарод, пенсій. Аднак пасада павятовага прадвадзіцеля дваранства з'яўлялася ганаровай, таму прызначаныя на яе асобы былі пазбаўлены жалавання па службе. У 1867 г. старшынёй з'езда міравых пасрэднікаў стаў павятовы прадвадзіцель дваранства. Гэта паспрыяла таму, што пасада стала аплачвацца. У адрозненне ад расійскіх губерняў, павятовыя прадвадзіцелі на тэрыторыі Беларусі атрымлівалі заробак у 2500 руб., а з 1875 г. – у 3000 руб.[9] Аднак кіраўнікі дваранства ва ўнутраных губернях валодалі большымі перавагамі ў праходжанні дзяржаўнай службы і прасоўванні па службовай лесвіцы: прадвадзіцелі беларускага краю з 1878 г. былі пазбаўлены права пераходу ў V класны чын пасля 9 гадоў выслугі на гэтай пасадзе ў папярэднім чыне[10].

Пры павятовым кіраўніку дваранства знаходзілася канцылярыя, у склад якой уваходзілі сакратар і канцылярскія служачыя[11]. Яны рыхтавалі і праводзілі звычайныя і надзвычайныя дваранскія сходы; складалі і выдавалі пасямейныя спісы і пасведчанні аб дваранскім паходжанні, запісвалі дваран у радаслоўныя кнігі; збіралі звесткі аб землеўладаннях, за якія неабходна было плаціць дзяржаўны і земскі збор; вялі ўліковую дакументацыю хлебных запасных магазінаў, ураджаяў збожжа і іншых сельскагаспадарчых культур; ажыццяўлялі кантроль за станам медыцыны ў павеце і правядзеннем санітарна-прафілактычных мерапрыемстваў; удзельнічалі ў арганізацыі прамысловых, сельскагаспадарчых і мастацкіх выстаў; збіралі ахвяраванні на пабудову ўстаноў адукацыі і іншыя справы, якія тычыліся самых розных сацыяльна-эканамічных бакоў жыцця дваранства [7, с. 208].

Паўнамоцтвы павятовых прадвадзіцеляў дваранства можна класіфікаваць па наступных крытэрыях: паводле парадку іх атрымання (па пасадзе і па выбары), функцый (кіруючыя і прадстаўнічыя), сферы кампетэнтнасці (саслоўныя і ўсесаслоўныя), часу дзеяння (часовы і пастаянныя). У 1861–1914 гг. праяўлялася тэндэнцыя да павелічэння ўсесаслоўных паўнамоцтваў і абавязкаў, якія насілі пастаянны характар.

Першай і адной з самых значных функцый з пераліку саслоўных абавязкаў павятовага прадвадзіцеля з'яўлялася кіраўніцтва дваранскім сходам, які ў Беларусі да 1863 г. з'яўляўся важным унутрысаслоўным органам. Згодна з заканадаўствам, дваране кожныя тры гады збіраліся на павятовыя сходы, дзе шляхам таемнага галасавання выбіралі сваіх прадстаўнікоў на мясцовыя службовыя пасады і дэлегатаў на губернскі сход. На сходах вяліся абмеркаванні і прымаліся рашэнні, якія тычыліся ўсіх унутрысаслоўных спраў, напрыклад збору грашовых сродкаў для ўласных патрэб, адкрыцця дваранскіх навучальных устаноў, апекавання над маёнткамі дваран [4, с. 202]. Павятовыя сходы скліkаліся за тры месяцы да губернскага сходу і вялі падрыхтоўку да яго: правяралі спісы дваран павета і наяўнасць у апошніх выбарчых правоў, папярэдне абмяркоўвалі некаторыя іншыя пытанні. Удзельнічаць у пасяджэннях сходу маглі ўсе спадчынныя дваране павета, аднак права голасу было толькі ў землеўладальнікаў, якія мелі неабходны маёмасны і ўзроставы (25 гадоў) цэнз.

Другой важнай функцыяй павятовых прадвадзіцеляў з'яўлялася вядзенне саслоўных спісаў. У кожнай губерні дэпутацкім сходам складалася радаслоўная кніга, у якую запісваліся ўсе дваране губерні, каб даць магчымасць кожнаму з іх даказаць сваё паходжанне [8, с. 747]. Гэта кніга ўяўляла сабой алфавітны спіс дваран, які прадстаўляўся павятовым прадвадзіцелем у губернскі дэпутацкі сход. Таму прадвадзіцель быў абавязаны ўносіць у спісы як дзяцей дваран, так і тых, хто прылічваўся да дваранскага саслоўя. Запіс нованароджаных дзяцей з'яўляўся адказнай справай: дзякуючы гэтаму прадвадзіцель ведаў склад сям'і двараніна, што было важна найперш для ўстанаўлення апекі [8, с. 212].

Трэцяй з ліку асноўных саслоўных функцый павятовага прадвадзіцеля дваранства было кіраўніцтва дваранскай апекай, якая ў Расіі была заснавана згодна з Установамі для кіравання губерняў Усерасійскай імперыі» (1775) і Даравальнай граматай дваранству (1785) пры павятовых судах [10, с. 5, 113]. Пры імператару Паўле І апекі былі скасаваны, але пры Аляксандру І іх аднавілі. У сувязі з ліквідацыяй павятовых судоў на тэрыторыі Беларусі па рашэнні Дзяржаўнага савета ад 23 кастрычніка 1867 г. «Аб часовым пераўтварэнні дваранскіх апек у паўночна- і паўднёва-заходніх губер-

[9] *Подорожняя Е. А.* Местные органы государственной власти и управления в Беларуси (1861–1914 гг.): структура, функции, кадры : дисс. … канд. ист. наук : 07.00.02. Минск, 2014. С. 48.
[10] Там же. С. 49.
[11] Памятная книжка Минской губернии на 1878 г. Минск : Минский стат. ком., 1878. С. 153.

нях» апекі былі перададзены ў ведамства Міністэрства ўнутраных спраў[12]. Гэты павятовы орган на чале з кіраўніком дваранства складаўся з двух засядацеляў з ліку мясцовых дваран, пісара і пратакаліста. Рэарганізацыя дваранскіх апек прайшла адначасова з увядзеннем міравых судовых устаноў у беларускіх губернях. Спісы кандыдатаў у засядацелі апек павятовы прадвадзіцель прад'яўляў начальніку губерні, які зацвярджаў засядацеляў на пасадах. Апошнія павінны былі абавязкова мець не польскае паходжанне, пры адсутнасці адпаведных асоб губернатар мог прызначаць на гэту пасаду і каронных чыноўнікаў[13]. Але з павольным павелічэннем у беларускім краі «не польскіх» землеўладальнікаў такая праблема час ад часу паўставала. Напрыклад, полацкі прадвадзіцель у 1871 г. прапанаваў віцебскаму губернатару кандыдатуры з адстаўных вайскоўцаў: падпалкоўніка А. В. Літвінава і падпаручыка І. Г. Гутоўскага; у сваю чаргу, прадвадзіцель Лепельскага павета рэкамендаваў да прызначэння мясцовых чыноўнікаў пісараў В. Шчэнсновіча і А. Саковіча, запэўніваючы губернатара ў іх «службовай дасведчанасці і карысці»[14].

У першую чаргу дваранскім апекам даручалася дапамога ўдовам і сіротам дваранскага паходжання, якія не маглі самастойна весці сваю гаспадарку. Па патрабаванні губернскага кіраўніка павятовы прадвадзіцель павінен быў сабраць адпаведныя звесткі аб цяжкім матэрыяльным стане прадстаўнікоў павятовага дваранства. Пасля гэтага кіраўніку дваранства неабходна было паведаміць дваранскай апецы пра асоб, якія засталіся ў павеце без мужоў ці бацькоў, прыклаўшы неабходнае пасведчанне [10, с. 26]. Акрамя таго, дваранская апека ўстанаўлівала апякунства над маёмасцю памерлага памешчыка ў выпадках адсутнасці спадкаемцаў і наяўнасці спрэчак наконт завяшчання, падзелу і ў іншых выпадках. Павятовым апекам неабходна было весці нагляд і аказваць дапамогу розным катэгорыям дваран: звар'яцелым, асобам з абмежаванымі магчымасцямі, марнатраўцам. У прыватнасці, 1 кастрычніка 1896 г. да мінскага губернскага прадвадзіцеля звярнулася дваранка К. Стэфановіч з хадайніцтвам аб прызнанні яе мужа А. Стэфановіча марнатраўцам і аб апякунстве над іх гаспадаркай. Мінскі павятовы прадвадзіцель пасля збору неабходных звестак адзначыў, што «дваранін А. Стэфановіч, маючы жонку і шасцярых дзяцей, злоўжывае алкаголем, гаспадаркай амаль не займаецца, а ўчасткі зямлі здае ў арэнду розным асобам, а грошы прапівае, з-за чаго сям'я знаходзіцца ў складаным становішчы і мае патрэбу ў дапамозе»[15]. Згодна з правіламі ўсталявання апекі, справа А. Стэфановіча разглядалася на пасяджэнні прадвадзіцеляў і дэпутатаў дваранства Мінскай губерні, дзе было прынята рашэнне аб апякунстве над гаспадаркай сям'і. Над маёмасцю марнатраўцаў прызначалася апека да таго часу, пакуль асоба не выправіцца.

Закон указвае і яшчэ на некаторыя менш важныя функцыі павятовага прадвадзіцеля: раздзяленне зямель паміж апекунамі і асобамі, якія знаходзяцца пад іх апекай, нагляд за павятовымі дзіцячымі прытулкамі, дапамога бедным дваранскім дзецям падчас паступлення ў вучылішчы і на службу, удзел у павятовых камітэтах грамадскага догляду і інш. [8, с. 217–218]. Апекі маглі перадаваць апекунам маёнткі за пазямельныя спрэчкі, запазычанні і жорсткія адносіны да сялян.

Акрамя ўнутрысаслоўных функцый, мясцовыя прадвадзіцелі дваранства прымалі актыўны ўдзел у шматлікіх пераўтварэннях і былі неад'емным звяном у рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі пры правядзенні сялянскай, судовай, земскай рэформ, пры зменах у народнай адукацыі. Павятовыя прадвадзіцелі маглі выказаць губернатарам сваё меркаванне падчас увядзення ў беларускіх губернях міравых судоў у 1872 г. Дрысенскі прадвадзіцель «прызнаваў магчымасць увядзення ў павеце выбараў міравых суддзяў і ўстанаўлення галоснага ходу судовай справы на агульных пачатках», лепельскі прадвадзіцель, наадварот, прапанаваў адмовіцца ад выбару суддзяў на агульных прынцыпах па прычыне «нізкага працэнта рускіх землеўладальнікаў», полацкі прадвадзіцель выказаўся пра некаторыя адхіленні ад судзебных статутаў, напрыклад змяншэнне маёмаснага цэнзу для кандыдатаў у міравыя суддзі, пра іх зацвярджэнне на пасадзе губернатарам, адмаўленне ад канфесійнай прыналежнасці, гэта значыць пра магчымасць прызначаць на пасады ганаровых суддзяў і прысяжных засядацеляў у тым ліку і католікоў[16].

Павятовыя прадвадзіцелі дваранства адыгрывалі істотную ролю ў функцыянаванні мясцовай судовай сістэмы. Згодна са статусам ад 20 лістапада 1864 г., мясцовы прадвадзіцель на чале павятовага земскага сходу прымаў удзел у выбары міравых суддзяў, але па прычыне адсутнасці ў Беларусі земскіх органаў самакіравання лідары дваранства не мелі такіх магчымасцей (у адрозненне ад дваранства цэнтральных губерняў). Аднак у беларускім краі аказвалі павятовыя прадвадзіцелі ўскосны ўплыў на фарміраванне складу ўчастковых і ганаровых міравых суддзяў, бо менавіта яны прад'яўлялі губернатару спіс кандыдатаў на гэтыя пасады, яго разглядаў міністр юстыцыі, які затым прызначаў

[12]ПСЗРИ. Собр. 2. СПб., 1867. Т. 42. Отд-ние 1, № 45089. С. 247.
[13]НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 35249. Арк. 1.
[14]Там жа. Арк. 3–4.
[15]Там жа. Ф. 321. Воп. 1. Спр. 347. Арк. 5. (Тут і далей пераклад наш. – *А. Л.*).
[16]Там жа. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 35111. Арк. 9, 12, 14 – 14 адв.

асоб на службу ў міравыя суды[17]. Значна большы ўплыў аказваў прадвадзіцель дваранства на складанне спісаў прысяжных засядацеляў акруговага суда, бо ён узначальваў спецыяльную камісію, куды ўваходзілі таксама прадстаўнік ад акруговага суда, павятовы спраўнік, гарадскі галава, земскія начальнікі і гарадскі суддзя[18].

Павятовыя кіраўнікі дваранства аказвалі значны ўплыў на дзейнасць органаў сялянскага кіравання. Згодна з палажэннем ад 19 лютага 1861 г., прадвадзіцель быў пастаўлены на чале павятовага з'езда міравых пасрэднікаў[19]. У сувязі з адменай дваранскіх выбараў у 1863–1864 гг. прадвадзіцелі былі зняты з кіраўніцтва міравымі з'ездамі, але ў 1867 г. па рашэнні віленскага генерал-губернатара Э. Т. Баранава ўрад вярнуўся да практыкі прызначэння прадвадзіцеляў на пасаду старшыні з'езда [5, с. 9]. У адрозненне ад унутраных губерняў імперыі, дзе дваранскія сходы выбіралі на пасады міравых пасрэднікаў, памешчыкі беларускага краю страцілі такое права. Пасля паўстання 1863–1864 гг. функцыя прызначэння міравых пасрэднікаў у Беларусі перайшла ў рукі міністра ўнутраных спраў і мясцовага губернатара [5, с. 8]. Замест ліквідаванага ў 1878 г. у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях інстытута міравых пасрэднікаў былі створаны павятовыя сялянскія прысутнасці, якія ўзначалілі мясцовыя прадвадзіцелі дваранства[20]. У Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях міравыя пасрэднікі працягвалі сваю дзейнасць да 1903 г. для вырашэння спраў аб выкупе чыншавых участкаў 9 чэрвеня 1886 г. былі створаны павятовыя па чыншавых справах прысутнасці на чале з прадвадзіцелем дваранства[21].

З увядзеннем на тэрыторыі Беларусі ў 1901–1903 гг. інстытута земскіх начальнікаў прадвадзіцелі дваранства былі пастаўлены на чале адміністрацыйнай і судовай прысутнасці павятовага з'езду[22]. Пры гэтым павятовыя прадвадзіцелі ўплывалі на фарміраванне складу земскіх начальнікаў, прапаноўваючы губернатару губерні спіс кандыдатур на пасады. Перамяшчэнне земскага начальніка з аднаго ўчастка на другі адбывалася тым жа шляхам. Як старшыня з'езду, павятовы прадвадзіцель разглядаў справаздачы земскіх начальнікаў і праводзіў рэвізіі, вынікі якіх накіроўваліся ў губернскую прысутнасць[23]. Адміністрацыйная прысутнасць павятовага з'езда разглядала пытанні прызначэння, звальнення і службовай адказнасці асоб сялянскага самакіравання, вызначала памеры жалавання служачым валасных праўленняў, магла адмяняць прысуды сельскіх і валасных сходаў. Павятовы з'езд каардынаваў дзейнасць органаў сялянскага кіравання пры неабходнасці харчовай дапамогі ў перыяд неўраджаяў. Падрыхтоўка дакладаў аб стане адміністрацыйных спраў, выклік удзельнікаў з'езду і ўсе распараджэнні былі важнымі абавязкамі старшыні з'езда. Пастановы і распараджэнні адміністрацыйнай прысутнасці прыводзіліся ў выкананне па даручэнні прадвадзіцеля земскімі начальнікамі або службовымі асобамі сялянскага самакіравання. У судовай прысутнасці пад кіраўніцтвам павятовага прадвадзіцеля разглядаліся справы, а менавіта скаргі на рашэнні валасных судоў, земскіх начальнікаў і гарадскіх суддзяў. Як правіла, прадвадзіцель павінен быў схіляць бакі да згоды, а пасля пастановы прысуду тлумачыў удзельнікам спрэчкі парадак абскарджання [1, с. 37].

На працягу правядзення сталыпінскай аграрнай рэформы ўплыў мясцовых павятовых прадвадзіцеляў дваранства толькі павялічыўся, таму што яны кіравалі працай створаных указам ад 4 сакавіка 1906 г. землеўладкавальных камісій[24]. Гэтыя камісіі ажыццяўлялі тэхнічнае забеспячэнне землеўладкавання, кантралявалі юрыдычны, судовы і фінансавы бакі гэтага працэсу. Такім чынам, павятовыя прадвадзіцелі дваранства былі пастаўлены на чале ўсіх сялянскіх устаноў.

Адной з важных функцый павятовага прадвадзіцеля дваранства было кіраванне арганізацыяй воінскага прызыву і ваенна-конскімі перапісамі ў павеце. Яшчэ да ўвядзення ў 1874 г. усеагульнай воінскай павіннасці мясцовы кіраўнік дваранства прымаў удзел у правядзенні рэкруцкіх набораў. Аднак у выніку ваеннай рэформы ў Расійскай імперыі роля кіраўнікоў павета ў гэтай сферы толькі ўзрасла: прадвадзіцелі ўзначалілі павятовыя прысутнасці па вайсковых справах. У якасці старшыні яны ажыццяўлялі кантроль за ходам прызыву ў войска на тэрыторыі павета. Прысутнасць складала і правярала спісы прызыўнікоў, вызначала льготы па сямейным становішчы, разглядала заявы на адтэрміноўку прызыву, размяркоўвала навабранцаў па прызыўных камандах, а таксама вяла нагляд за вайскоўцамі, звольненымі ў запас [10, с. 536].

Падзеі рэвалюцыі 1905–1907 гг. аказалі ўплыў на стварэнне новых урадавых устаноў на павятовым узроўні. Павятовыя прадвадзіцелі дваранства ўвайшлі ў склад павятовых камісій па выбарах у Дзяржаўную думу. Камісіі з'яўляліся часовымі органамі,

[17]НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 6515. Арк. 162–163 адв.
[18]Там жа. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 5526. Арк. 5.
[19]ПСЗРИ. Собр. 2. СПб., 1861. Т. 36. Отд-ние 1, № 36 660. С. 213.
[20]Там же. Собр. 2. СПб., 1874. Т. 49. Отд-ние 1, № 53 678. С. 929.
[21]Там же. Собр. 3. СПб., 1886. Т. 6. Отд-ние 1, № 3789. С. 279.
[22]Там же. Собр. 3. СПб., 1889. Т. 9. Отд-ние 1, № 6196. С. 517.
[23]Акт ревизии, произведенной пинским уездным предводителем дворянства И. А. Папа-Афанасопуло во втором земском участке Пинского уезда 5–7, 16, 17, 26, 27 августа 1908 года. Минск : Губерн. типогр.; 1908. С. 1.
[24]ПСЗРИ. Собр. 3. СПб., 1906. Т. 26. Отд-ние 1. № 27478. С. 199.

таму што функцыянавалі толькі ў перыяд выбарчага працэсу. У склад камісіі, акрамя прадвадзіцеля дваранства, уваходзілі член акруговага суда (старшыня), гарадскі суддзя, старшыня павятовай земскай управы, гарадскі галава павятовага горада і адзін з земскіх начальнікаў [7, с. 201]. Згодна з Палажэннем аб выбарах у Дзяржаўную думу, камісіі збіраліся для праверкі правільнасці выбараў, разгляду заяў і скаргаў, якія паступалі ў ходзе выбарчай кампаніі, правяралі спісы выбаршчыкаў, уносілі карэктывы ў размеркаванне іх па курыі, складалі спісы выбаршчыкаў ад павета ў губернскі выбарчы сход. Прадвадзіцелі неслі адказнасць за праверку пасведчанняў выбаршчыкаў, за азнаямленне з правіламі правядзення выбараў. Акрамя таго, яны павінны былі весці падлік галасоў і падпісваць выбарчыя лісты. У выпадку парушэнняў павятовая камісія на чале са старшынёй магла адмяніць вынікі выбараў у любой курыі.

Павятовыя прадвадзіцелі дваранства ўзначальвалі мясцовую сістэму народнай асветы. З 1912 г. у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях уступіла ў сілу Палажэнне аб пачатковых народных вучылішчах ад 25 мая 1874 г.[25] Згодна з гэтым дакументам мясцовыя прадвадзіцелі дваранства сталі старшынямі павятовых вучылішчных саветаў, якія займаліся каардынацыяй працы ўсіх устаноў адукацыі, выступалі з прапановай аб адкрыцці і закрыцці пачатковых школ, вялі нагляд за адукацыйным працэсам, зацвярджалі і звальнялі з пасад настаўнікаў народных вучылішчаў. Акрамя функцый па кіраванні саветам, павятовы прадвадзіцель дваранства павінен быў па магчымасці наведваць школы сваёй тэрытарыяльнай адзінкі, цікавіцца патрэбамі гэтых навучальных устаноў і знаходзіць сродкі для іх задавальнення. Падчас візіту ў школы кіраўнік павета павінен быў пераканацца ў маральных якасцях настаўнікаў. На прадвадзіцелях ляжалі абавязкі па падтрымцы існуючых і адкрыцці новых школ, наглядзе за правільным наведваннем іх навучэнцамі. Зыходзячы з пералічаных абавязкаў, кіраўнікі паветаў неаднаразова кантактавалі з апекуном Віленскай навучальнай акругі і міністрам народнай асветы. Напрыклад, гарадоцкі павятовы прадвадзіцель Ф. В. Бондыраў адкрываў пачатковыя школы ў павеце, а пасля пераходу на пасаду полацкага прадвадзіцеля ён жа садзейнічаў адкрыццю звыш ста земскіх школ, а царкоўна-прыходскія школы атрымалі неабходную гаспадарчую падтрымку[26].

З заснаваннем у 1885 г. павятовых прысутнасцей па піцейных справах роля кіраўнікоў лягла менавіта на мясцовага кіраўніка дваранства[27]. Менш важнай функцыяй павятовых прадвадзіцеляў дваранства з'яўляецца кіраўніцтва павятовымі камітэтамі народнай цвярозасці[28]. Гэтыя камітэты размяркоўвалі паміж участковымі апекунамі месцы іх дзейнасці, сачылі за продажам спіртных напояў у піцейных установах і супрацьдзейнічалі таемнаму збыту алкаголю, складалі рапарты аб парушэннях правіл продажу і злоўжыванні алкагольнымі напоямі розных асоб. Пры ўдзеле полацкага прадвадзіцеля дваранства Ф. В. Бондырава ў павятовым цэнтры было адкрыта дабрачыннае таварыства, якое садзейнічала стварэнню таннай сталовай і школы для непаўналетніх, што аблягчыла стан гарадской бедныаты і спрыяла скарачэнню колькасці жабракоў. Падчас эпідэміі халеры былі арганізаваны чайныя і сталовыя для бедных[29].

На прадвадзіцеляў дваранства пры ўвядзенні на тэрыторыі Беларусі земскіх устаноў лягла функцыя кіраўніцтва земскімі органамі самакіравання. У 1903–1911 гг. павятовыя прадвадзіцелі дваранства на правах кіраўнікоў сталі на чале павятовых камітэтаў і ўпраў па справах земскай гаспадаркі[30]. З увядзеннем у 1911 г. на тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў Палажэння аб губернскіх і павятовых земскіх установах ад 1890 г. мясцовыя прадвадзіцелі ўзначалілі павятовыя земскія сходы і ўправы[31]. Не з'яўляючыся выбраным старшынёй земскага сходу і земскай управы, а значыць, прадстаўніком якой-небудзь групы грамадства, прадвадзіцель дваранства мог весці пасяджэнні справядліва, а аплачваемы характар службы не дазваляў падазраваць яго ў подкупе [1, с. 31]. Акрамя таго, дзяржаве было важна, каб на чале выбарных земскіх органаў самакіравання знаходзіліся такія асобы, якім можна было б давяраць і якія ў большасці выпадкаў маглі б скарэкціраваць дзейнасць павятовага земства менавіта так, як будзе патрэбна ўраду. Кіруючы ўсімі ніцямі земскай гаспадаркі, павятовыя прадвадзіцелі забяспечылі медыцынскія земскія пункты належнымі памяшканнямі, закладку трактаў, мастоў і рамонт дарог[32]. Нарэшце, у земскай галіне прадвадзіцелі кіравалі працай павятовых ацэначных камісій, якія право-

[25]НГАБ. Ф. 2254. Воп. 2. Спр. 729. Арк. 11.

[26]25-летие служения в должности уездного предводителя дворянства Витебской губернии д. с. с. Федора Васильевича Бондырева. Витебск, 1911. С. 2.

[27]ПСЗРИ. Собр. 3. СПб., 1885. Т. 5. Отд-ние 1, № 2946. С. 201.

[28]Там же. Собр. 3. СПб., 1894. Т. 14. Отд-ние 1, № 11152. С. 683.

[29]25-летие служения в должности уездного предводителя дворянства Витебской губернии д. с. с. Федора Васильевича Бондырева. Витебск, 1911. С. 3.

[30]ПСЗРИ. Собр. 3. СПб., 1903. Т. 23. Отд-ние 1, № 22757. С. 334–353.

[31]Там же. Собр. 3. СПб., 1911. Т. 31. Отд-ние 1, № 34903. С. 170–175.

[32]25-летие служения в должности уездного предводителя дворянства Витебской губернии д. с. с. Федора Васильевича Бондырева. Витебск, 1911. С. 2.

дзілі ацэнку нерухомай маёмасці для абкладання яе земскімі зборамі[33]. Ацэначная камісія склікалася па меры неабходнасці ўласным старшынёй – павятовым прадвадзіцелем. Дзейнасць гэтых камісій была надзвычай важнай для земскага самакіравання, таму што ад іх залежала матэрыяльнае забеспячэнне земстваў. Такім чынам, у галіне павятовага земскага самакіравання асоба павятовага прадвадзіцеля дваранства адыгрывала ключавую ролю, звязаную з агульным кіраваннем мясцовай гаспадаркай.

Акрамя пералічаных вышэй функцый, павятовы прадвадзіцель дваранства прымаў удзел у губернскім дваранскім дэпутацкім сходзе, а таксама ў асобай канцылярыі акруговага суда і судовай палаты, ажыццяўляў праверку рашэнняў сялянскіх таварыстваў аб выгнанні распусных членаў, правяраў дзейнасць земскіх начальнікаў, валасных упраў, выдаваў рознага роду пасведчанні [4, с. 203].

У выніку павятовы прадвадзіцель дваранства ўваходзіў у склад усіх павятовых калегіяльных устаноў. Згодна з заканадаўствам, у пачатку XX ст. дваранскі кіраўнік меў 18 абавязкаў [8, с. 217–219]. Канцэнтрацыя ў руках прадвадзіцеля такой колькасці паўнамоцтваў ператварала яго ў гаспадара свайго павета і ў той жа час зніжала эфектыўнасць яго адміністрацыйнай дзейнасці. У выніку з гэтым, А. П. Карэлін адзначыў: «Кола абавязкаў прадвадзіцеля настолькі шырокае, што пунктуальнае выкананне ўсіх іх загадзя выключалася» [2, с. 224]. Фактычна ўдзел у шэрагу другасных устаноў – у турэмным камітэце, загадзе грамадскага догляду і г. д. – зводзіўся да роспісу ў журнале. Дасведчаныя прадвадзіцелі дваранства сярод сваіх незлічоных абавязкаў вылучала галоўныя, а іншыя адыходзілі на другі план ці нават перадаваліся іншым служачым [10, с. 45]. У той жа час, на думку саміх прадвадзіцеляў дваранства, шырокае кола абавязкаў прыводзіла да таго, што яны сталі аддаваць дзяржаўнай службе ўвесь свой час. П. П. Трубяцкі, які больш за 25 гадоў знаходзіўся на гэтай пасадзе ў Маскоўскім павеце, заўважыў, што для прадвадзіцеляў «не існуе календара са службовымі і неслужбовымі днямі, як гэта прынята ва ўсіх установах.Адметнасць яго службы ў тым, што ў святы можа быць больш спраў, чым у звычайны дзень» [10, с. 2].

Вышэйшыя ўрадавыя колы неаднаразова спрабавалі ўзяць пад кантроль незалежны ад іх элемент павятовай адміністрацыі. Па сведчаннях М. А. Каткова, у 1914 г. Дзяржаўная дума павінна была разгледзець праект аб рэфармаванні сістэмы павятовага кіравання. Згодна з праектам, замест павятовых з'ездаў земскіх начальнікаў, прысутнасцей па воінскай павіннасці, павятовых распарадчых камітэтаў неабходна стварыць вышэйшы орган – павятовую раду, а старшынёй яе будзе начальнік павятовага ўпраўлення, які прызначаецца міністрам унутраных спраў. Менавіта павятовы начальнік мусіў замяніць павятовага прадвадзіцеля, які ў такім выпадку страчваў кіруючыя функцыі ў павеце [1, с. 52]. Прыхільнікі новага праекта ўказвалі на нізкаякасную дзейнасць старых устаноў у працэсе ажыццяўлення рэформ і на неабходнасць стварэння цэнтралізаванай сістэмы павятовага кіравання. Праціўнікі павятовай рэформы ў абарону прадвадзіцеляў дваранства прыводзілі аргумент, згодна з якім кіраўнікі дваранства дакладна ведалі мясцовыя ўмовы, валодалі бясспрэчным аўтарытэтам сярод насельніцтва, а стварэнне замест саслоўных інстытутаў новых павятовых бюракратычных устаноў з прызначаных чыноўнікаў магло пашырыць карупцыю, безадказнасць і ў некалькі разоў павысіць расходы на яго ўтрыманне [1, с. 68]. Тым не менш з пачаткам Першай сусветнай вайны і па прычыне адсутнасці сродкаў праект павятовай рэформы так і не быў рэалізаваны, а пасада прадвадзіцеля дваранства ў сістэме мясцовага кіравання і самакіравання беларускіх губерняў праіснавала да 25 лістапада 1917 г. [4, с. 211].

Такім чынам, функцыянаванне інстытута павятовых прадвадзіцеляў дваранства на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. мела ўласную спецыфіку. Пад уплывам паўстання 1863–1864 гг. царскі ўрад унёс значныя змены ў парадак фарміравання органаў дваранскага самакіравання: былі адменены дваранскія выбары, а кандыдатаў на пасаду павятовага прадвадзіцеля прызначаў па прадстаўленні міністра ўнутраных спраў імператар. Аднак урад не мог адмовіцца ад выкарыстання прадвадзіцеляў у галіне дзяржаўнага кіравання, бо ў павеце адсутнічаў адзіны афіцыйны кіраўнік, якому наўпрост падпарадкоўваліся б усе мясцовыя ўстановы. Пры такіх абставінах павятовы прадвадзіцель станавіўся гаспадаром павета. З пераліку займаемых пасад і нададзеных ім функцый можна зрабіць выснову, што прадвадзіцель узначальваў амаль усе павятовыя ўстановы, меў кантакты з усімі саслоўямі, супрацоўнічаў з мясцовымі органамі ўлады і дзяржаўнымі ведамствамі. Ён прадстаўляў інтарэсы павета ў шэрагу губернскіх органаў і, у адрозненне ад губернскага прадвадзіцеля, валодаў выканаўчай уладай. Мясцовыя прадвадзіцелі дваранства, страціўшы старыя дарэформенныя абавязкі, атрымалі новыя, адміністрацыйныя, паўнамоцтвы ў рэфармаваным мясцовым кіраванні, а іх становішча засталося такім жа высокім і прэстыжным. Уплыў павятовых прадвадзіцеляў на дзяржаўную палітыку на месцах дасягнуў свайго апагея на пачатку XX ст., калі яны валодалі шырокімі паўнамоцтвамі трох тыпаў: саслоўнымі, бессаслоўнымі і дзяржаўнымі. У выніку іх становішча ў найважнейшых сферах жыцця грамадства яшчэ больш умацавалася.

[33] ПСЗРИ. Собр. 3. СПб., 1893. Т. 13. Отд-ние 1. № 9744. С. 414–420.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Катков МА. *Роль уездных предводителей дворянства в государственном управлении России*. Москва: Печатня А. И. Снегиревой; 1914. 70 с.
2. Корелин АП. *Дворянство в пореформенной России 1861–1904 гг.* Москва: Наука; 1979. 304 с.
3. Самбук СМ. *Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в*. Минск: Наука и техника; 1980. 223 с.
4. Жытко АП. *Дваранства Беларусі перыяду капіталізму, 1861–1914 гг*. Мінск: БДПУ; 2003. 233 с.
5. Жытко АП, Талмачова СА. Палітыка самадзяржаўя ў адносінах да інстытута павятовых прадвадзіцеляў дваранства на беларускіх землях (1861–1917 гг.). *Беларускі гістарычны часопіс.* 2013;4:4–13.
6. Каханоўскі АГ. *Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 г.)*. Мінск: БДУ; 2013. 333 с.
7. Снапковский ЮН, Яцкевич ДЛ, составители. *Могилевская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1772–1917).* Минск: Беларусь; 2014. 814 с.
8. Канторович ЯА. *Законы о состояниях*. Санкт-Петербург: Юридический книжный склад «Право»; 1911. 1032 с.
9. Шмелев ГН, редактор. *Акты царствования Екатерины II: учреждения для управления губерний и жалованные грамоты дворянству и городам*. Москва: Издание Московских женских курсов; 1907. 159 с.
10. Трубецкой ПП. *Памятная книга для уездного предводителя дворянства*. Одесса: Одесский вестник; 1887. 716 с.

## References

1. Katkov MA. *Rol' uezdnykh predvoditelei dvoryanstva v gosudarstvennom upravlenii Rossii* [The Role of County leaders of the nobility in the state administration of Russia]. Moscow: Pechatnya A. I. Snegirevoi; 1914. 70 p. Russian.
2. Korelin AP. *Dvoryanstvo v poreformennoi Rossii 1861–1904 gg.* [The Nobility in post-reform Russia 1861–1904]. Moscow: Nauka; 1979. 304 p. Russian.
3. Sambuk SM. *Politika tsarizma v Belorussii vo vtoroi polovine XIX v*. [Policy of tsarism in Belarus in the second half of the XIX century]. Minsk: Nauka i tekhnika; 1980. 223 p. Russian.
4. Zhytko AP. *Dvaranstva Belarusi peryjadu kapitalizmu, 1861–1914 gg.* [The nobility of Belarus during capitalism, 1861–1914]. Minsk: Belarusian State Pedagogical University; 2003. 233 p. Belarusian.
5. Zhytko AP, Talmachova SA. [The autocracy policy towards the institute of the pavet marshals of nobility in Belarus (1861–1914)]. *Belaruski gistarychny chasopis.* 2013;4:4–13. Belarusian.
6. Kakhanouski AG. *Sacyjal'naja transfarmacyja belaruskaga gramadstva (1861–1914 g.)* [Social transformation of Belarusian society (1861–1914)]. Minsk: Belarusian State Ubiversity; 2013. 333 p. Belarusian.
7. Snapkovskii IN, Iatskevich DL, compilers. *Mogilevskaya guberniya: gosudarstvennye, religioznye i obshchestvennye uchrezhdeniya (1772–1917)* [Mogilev province: state, religious and public institutions (1772–1917)]. Minsk: Belarus; 2014. 814 p. Russian.
8. Kantorovich YaA. *Zakony o sostoianiiakh* [Laws on estates]. Saint Peterburg: Yuridicheskii knizhnyi sklad «Pravo»; 1911. 1032 p. Russian.
9. Shmelev GN, editor. *Akty tsarstvovaniya Ekateriny II: uchrezhdeniya dlya upravleniia gubernii i zhalovannye gramoty dvoryanstvu i gorodam* [Acts of the reign of Catherine II: institutions for the administration of provinces and charters of nobility and cities]. Moscow: Izdanie Moskovskikh zhenskikh kursov; 1907. 159 p. Russian.
10. Trubeckoi PP. *Pamyatnaya kniga dlya uezdnogo predvoditelya dvoryanstva* [A memorial book for the county leader of the nobility]. Odessa: Odesskii vestnik; 1887. 716 p. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 20.12.2019.*
*Received by editorial board 20.12.2019.*